## МІХАІЛ ВЕНЬЯМІНАВІЧ НАВУЧЫЦЕЛЬ



Доктар эканамічных навук, прафесар кафедры эканамічных тэорый Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны Міхаіл Веньямінавіч Навучыцель нарадзіўся ў г. Іркуцку, тут жа скончыў сярэднюю школу. Працоўны шлях пачаўся ў жніўні 1942 г. са службы ў радах Савецкай Арміі. Пасля дэмабілізацыі закончыў Іркуцкі фінансава-эканамічны інстытут (1951), а потым завочна Іркуцкі дзяржаўны універсітэт (1953). У 1959 г. аспірант эканамічнага факультэта МДУ імя М. В. Ламаносава паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю, з 1969 г. ён — доктар эканамічных навук, з 1970 г. — прафесар кафедры палітычнай эканоміі Іркуцкага інстытута народнай гаспадаркі, дзе працаваў з 1951 г. і прайшоў шлях ад загадчыка кабінета палітычнай эканоміі да прарэктара па навуковай рабоце. У 1971 г. запрошаны на кафедру палітычнай эканоміі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, дзе працягвае плённа працаваць і сёння. Са снежня 1971 па 1989 г. займаў пасаду прарэктара па навуковай рабоце. Сёння М. В. Навучыцель — прафесар кафедры эканамічных тэорый.

Міхаіл Веньямінавіч — вопытны і патрабавальны педагог, аўтарытэтны настаўнік студэнцкай моладзі, таленавіты даследчык і арганізатар навукі. За час работы прарэктарам універсітэта ён унёс значны ўклад у арганізацыю фундаментальных і прыкладных даследаванняў, стварэнне новых навуковых устаноў, павышэнне ролі навукі ў падрыхтоўцы навукова-педагагічных кадраў. Курс, што чытае М. В. Навучыцель, нязменна прыцягвае ўвагу студэнтаў.

Сфера навуковых інтарэсаў М. В. Навучыцеля — эканамічная тэорыя і гісторыя эканамічных вучэнняў. Ён апублікаваў звыш 150 навуковых работ, у тым ліку 12 манаграфій і брашур, а таксама больш за 20 вучэбных дапаможнікаў, у тым ліку такія актуальныя сёння і карысныя не толькі студэнтам, як «Гісторыя эканамічных вучэнняў» (Мн., 1983) і «Рынкавая эканоміка: тэорыя і практыка» (Гомель, 1994). Міхаіл Веньямінавіч падрыхтаваў 21 кандыдата і 3 дактароў навук.

Актыўна ўдзельнічае ў грамадскім жыцці: выбіраўся дэпутатам Гомельскага абласнога і раённага Саветаў народных дэпутатаў, членам выканкома Цэнтральнага раёна Гомеля, з'яўляўся членам рэдкалегіі выдавецтва «Высшая школа» (Масква), членам навукова-метадычнага савета Мінасветы Беларусі, а цяпер — член рэдкалегіі «Весніка БДУ».

Ратная і навуковая педагагічная праца, а таксама грамадская дзейнасць М. В. Навучыцеля адзначаны ордэнам Вялікай Айчыннай вайны II ступені, 10 медалямі, Ганаровымі граматамі Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь. Ён удастоены ганаровага звання «Заслужаны работнік вышэйшай школы Рэспублікі Беларусь», узнагароджаны знакам «За выдатныя поспехі ў рабоце», ганаровымі граматамі Міністэрства народнай адукацыі.

Сардэчна віншуем М. В. Навучыцеля з юбілеем і жадаем добрага здароўя, шчасця, новых творчых поспехаў.